*Л.А.Дзямешка, прафесар*

# ДЗЕЙНАСЦЬ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ КАФЕДРАЎ ФАКУЛЬТЭТА ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАКУМЕНТНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

Практыка студэнтаў з'яўляецца важнай часткай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. У час практыкі студэнты выкарыстоўваюць тэарэтычныя веды ва ўмовах інфармацыйна-камунікатыўнай дзейнасці, назапашваюць прафесійны вопыт, упершыню асэнсоўваюць сябе як суб'екта вытворчай дзейнасці калектыву.

На факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый у адпаведнасці з вучэбнымі планамі прадугледжана некалькі відаў практыкі: бібліятэчная вучэбная і вытворчая; педагагічная азнаямленчая і актыўная; практыка ў кнігагандлёвых установах; археалагічная вучэбная; музейная вучэбная і вытворчая; пераддыпломная.

На факультэце была распрацавана мадэль бібліятэчнай практыкі, якая ўключае тры этапы: першапачатковае асэнсаванне студэнтам сваёй суб'ектнасці ў бібліятэчным асяроддзі (першы этап); самавызначэнне студэнтам найбольш прыярытэтных для сябе кірункаў бібліятэчнай дзейнасці ў суадносінах з асобаснымі ўстаноўкамі і якасцямі (другі этап); мадэліраванне будучым бібліятэкарам прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці з абранай спецыялізацыяй (трэці этап).

Метадычнай асновай мадэлі практыкі з'явілася канцэпцыя падрыхтоўкі спецыяліста як суб'екта бібліятэчнага асяроддзя.

Істотнымі асаблівасцямі асэнсавання маладым спецыялістам свайго месца ў інфармацыйна-дакументнай сферы з'яўляюцца:

– зацікаўленасць абранай прафесіяй;

– станоўчае самаадчуванне ў працоўным калектыве;

– здольнасць кіраваць дзеяннямі, эмоцыямі, практычна ацэньваць, перайначваць (пры неабходнасці) рэчаіснасць, кры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тычна ставіцца да сябе, паважаць супрацоўнікаў і карыстальнікаў бібліятэкі;

– уменні арганізаваць пэўным чынам стасункі з чытачамі, выкарыстоўваць інавацыйныя тэхналогіі; рэалізоўваць планы і праекты, кантраляваць іх ход і ацэньваць вынікі сваёй дзейнасці.

Мадэль выглядае наступным чынам.

| | |
|---|---|
| I этап<br>II курс | Вучэбная азнаямленчая практыка (без адрыву ад заняткаў)<br>Змест: азнаямленне ў форме экскурсій у бібліятэкі г.Мінска з:<br>гісторыяй бібліятэкі;<br>арганізацыйнай структурай;<br>інфармацыйнымі рэсурсамі;<br>паказчыкамі дзейнасці;<br>напрамкамі дзейнасці;<br>тэхналагічнымі працэсамі;<br>навуковымі даследаваннямі;<br>перспектывамі развіцця |
| II этап<br>IV курс | Бібліятэчная вытворчая практыка (па агульнай праграме для ўсіх спецыялізацый)<br>Змест: бібліятэчныя фонды;<br>каталагізацыя дакументаў;<br>бібліятэчнае абслугоўванне чытачоў;<br>бібліяграфічнае абслугоўванне |
| III этап<br>V курс | Бібліятэчная вытворчая практыка (у адпаведнасці з абранай спецыялізацыяй)<br>Змест цалкам адпавядае спецыялізацыям студэнтаў:<br>публічныя бібліятэкі;<br>навукова-тэхнічныя і спецыяльныя бібліятэкі;<br>дзіцячыя і школьныя бібліятэкі;<br>аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы;<br>бібліятэказнаўства і бібліяграфія, замежная мова;<br>бібліятэказнаўства і бібліяграфія, краязнаўства;<br>менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы;<br>кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю<br>Пераддыпломная практыка |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На кожным этапе вызначаюцца мэты, задачы, арганізацыйныя формы і практычныя заданні.

Мадэль апраўдала сябе: мэтазгоднасць этапаў пацвердзіў змест практыкі, што вызначаўся пэўнымі скразнымі праграмамі. Такім чынам, мадэліраванне бібліятэчнай практыкі адкрыла магчымасць сістэматызацыі і паслядоўнасці яе працэсу, вызначэнню шляхоў удасканалення.

Наступным крокам стала стварэнне арганізацыйных і метадычных матэрыялаў. Было распрацавана Палажэнне аб вучэбнай і вытворчай практыцы студэнтаў факультэта ІДК, якое вызначыла мэту практыкі, яе базы, змест, арганізацыю і кіраванне практыкай, абавязкі савета, кафедраў, баз, кіраўнікоў практыкі ад факультэта і ад баз, студэнтаў-практыкантаў, парадак падвядзення вынікаў.

Акрамя Палажэння былі распрацаваны скразныя праграмы практыкі: вучэбнай для студэнтаў другога курса; вытворчай практыкі для студэнтаў чацвёртага курса па наступных кірунках: бібліятэчныя фонды, каталагізацыя дакументаў, бібліятэчнае і бібліяграфічнае абслугоўванне чытачоў; вытворчай для студэнтаў пятага курса па васьмі спецыялізацыях. Вытворчая практыка студэнтаў пятага курса па спецыялізацыі "кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю" прадугледжвала выкананне практычных заданняў як у бібліятэках, так і ў кнігагандлёвых арганізацыях.

Па спецыялізацыі "бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура" прадугледжана атрыманне выпускнікамі другой спецыяльнасці – выкладчыка беларускай мовы і літаратуры. Таму вучэбны план уключае педагагічную практыку. Скразныя праграмы педагагічнай практыкі – азнаямленчай для студэнтаў трэцяга курса і актыўнай для студэнтаў чацвёртага і пятага курсаў – былі распрацаваны на кафедры беларускай філалогіі.

Эфектыўна праходзіць практыка па спецыяльнасці "музейная справа і ахова помнікаў гісторыі". На першым курсе вучэбная практыка накіравана на азнаямленне з музеямі-запаведнікамі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі. Яна праводзіцца ў форме экскурсій. Студэнты наведваюць курганы, замчышчы, гарадзішчы. На другім курсе ў працэсе археалагічнай вучэбнай практыкі студэнты знаёмяцца з методыкай археалагічных раскопак, прымаюць у іх удзел, замацоўваюць веды па апрацоўцы і класіфікацыі археалагічных знаходак.

Вытворчая практыка на трэцім курсе прадугледжвае практычныя заданні ў галіне археалогіі: праца па камплектаванні і ўліку археалагічных калекцый, кансервацыі і рэстаўрацыі прадметаў археалогіі. На чацвёртым курсе навучэнцы працуюць з музейнымі фондамі, з іх каталагізацыяй і ўлікам экспанатаў; абслугоўваюць наведвальнікаў музеяў. Музейная вытворчая практыка на пятым курсе прадугледжвае цесную сувязь тэарэтычных ведаў, атрыманых на працягу вучобы, і практычных навыкаў будучых супрацоўнікаў музеяў. Яны вывучаюць гісторыю стварэння пэўных музеяў, асноўныя напрамкі іх дзейнасці, структуру; авалодваюць методыкай і практыкай правядзення агульных і тэматычных экскурсій. Адначасова рыхтуюць канчатковы варыянт дыпломных праектаў.

Усе віды практыкі на працягу пяці гадоў навучання скіраваны на прафесійную арыентацыю маладога спецыяліста, на паглыбленне і пашырэнне тэарэтычных ведаў у розных напрамках музейнай работы – музейна-арганізацыйнай, навукова-асветніцкай, рэстаўрацыйна-ахоўнай, музейным менеджменце. Такім чынам, на факультэце цалкам створана метадычная база для арганізацыі і правядзення практыкі студэнтаў па ўсіх спецыяльнасцях і спецыялізацыях.

Але ў паслядоўнасці і бесперапыннасці практыкі будучых бібліятэчных работнікаў аказалася прапушчаным адно звяно – менавіта трэці курс. Азнаямленчая практыка здзяйснялася на другім курсе, а вытворчая пачыналася з чацвёртага. Таму было вырашана перанесці пачатак бібліятэчнай вытворчай практыкі з чацвёртага курса на трэці, пасля азнаямленчай на другім. Новы вучэбны план гэта прадугледжвае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма для студэнтаў трэцяга курса распрацоўвалася па тых дысцыплінах, якія студэнты вывучаюць на другім і палове трэцяга курса, а менавіта па фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў, іх каталагізацыі і бібліяграфічнай рабоце. У адпаведнасці з новым вучэбным планам прадугледжана таксама бесперапыннасць педагагічнай практыкі для студэнтаў спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура". Азнаямленчая практыка перанесена з трэцяга курса на другі, а на трэцім, чацвёртым і пятым курсах студэнты будуць паралельна з бібліятэчнай праходзіць актыўную педагагічную практыку: рыхтавацца да ўрокаў і праводзіць іх, займацца пазакласнай работай, працаваць з адстаючымі вучнямі.

Студэнты трэцяга і чацвёртага курсаў спецыялізацыі "кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю" праходзяць бібліятэчную вытворчую практыку па агульнай праграме. На пятым курсе яна адбываецца ў бібліятэках і ў кнігагандлёвых арганізацыях.

Галоўныя пытанні арганізацыі практыкі на дадзены момант наступныя:

— пашырыць кантынгент баз практыкі за кошт розных рэгіёнаў краіны, вярнуць былы вопыт выязной практыкі ў складзе студэнцкіх брыгад. Выязная практыка неабходна па прычыне працы выпускнікоў пасля заканчэння ВНУ на рэгіянальных аб'ектах;

— вырашыць праблему аб сумяшчальнасці тэм дыпломных праектаў са спецыфікай дзейнасці базавых устаноў, што будзе спрыяць удасканаленню пераддыпломнай практыкі;

— уключыць у праграмы практыкі прафарыентацыйную работу студэнтаў сярод моладзі і выпускнікоў сярэдніх школ, распрацаваць метадычныя матэрыялы па гэтым кірунку і забяспечыць імі ўсе базы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ